# Даклад Старшыні Савету Народных Камісараў Беларускае Соцыялістычнае Савецкае Рэспублікі тав. Яз. А. Адамовіча.

Таварышы, толькі Кастрычнікавая рэволюцыя, вырашаючы нацыянальнае пытаньне ў Савецкім Саюзе, які абхапляе такую вялізарную тэрыторыю і такую колькасьць нацыянальнасьцяй, дала магчымасьць нам, на грунце політыкі савецкае ўлады, мець на сёнешні дзень поўны нацыянальны спакой, пабудаваны на нацыянальным самавызначэньні, на поўным садрустве працоўных усіх нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу. Кастрычнікавая рэволюцыя зьнішчыла ўгнятацеляў і выслабаніла прыгнечаных. У нас цяпер няма вялікіх і малых нацыянальнасьцяй, у нас усе нацыянальнасьці роўныя. Гэты факт сам па сабе зьяўляецца лепшым доказам правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня. Толькі дзякуючы гэтаму мы засухоўваем даклады нацыянальных рэспублік на сэсіях ЦВК Саюзу ССР. Ні ў аднэй буржуазнай дзяржаве, дзе існуюць прыгнечаныя нацыянальнасьці, а над імі тая ці іншая пануючая нацыя, парлямэнт ня ставіць дакладаў аб жыцьці, дзейнасьці і патрэбах тае ці іншае нацыянальнасьці, якая не зьяўляецца пануючаю ў данай дзяржаве, у данай рэспубліцы. Калі-б, напрыклад, у суседняй буржуазнай рэспубліцы, якая мяжуецца з Савецкаю Беларусьсю, сталі слухаць на сойме даклад аб патрэбах і жыцьці беларускага народу, дык гэты даклад абярнуўся-б у крык прыгнечанага беларускага народу,—крык таму, што ва ўмовах аграрнай перанаселенасьці там ёсьць „асадніцтва“, якое буржуазная рэспубліка ўтварае сярод беларускага народу; крык таму, што зачыняюцца беларускія школы, ліквідуюцца беларускія газэты, дзякуючы чаму беларускае насельніцтва пазбаўляецца магчымасьці навучацца на сваёй роднай мове; крык таму, што пры цяжкім экономічным становішчы на беларускае сялянства накладаюць вялікія падаткі; крык таму, што існуе бясправье: яшчэ да гэтага часу ў рэспубліцы, якая мяжуецца з намі, дзейнічаюць царскія законы 1864 году; гэты крык раздаўся-б і таму, што ўсё нацыянальна-рэволюцыйнае душыцца і прыгнечваецца як у экономічных, гэтак і ў політычных адносінах.

Ясна, што пры такім становішчы ні адна буржуазная рэспубліка не магла-б дапусьціць, каб гэты крык раздаваўся ў сьценах самога буржуазнага парлямэнту ці сойму. Пры нацыянальных і клясавых супярэч-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

насьцях, існуючых наогул у буржуазных дзяржавах, нараджаюцца і растуць рэвалюцыйныя сілы, якія карэньнямі сваімі ўваходзяць глыбока ў жыцьцё. Толькі за тое, што рэвалюцыйныя групы арганізуюцца для абстайваньня сваіх нацыянальных, культурных і эканамічных інтарэсаў, прадстаўнікоў іх арыштоўваюць, трымаюць у вастрогах, прыгнятаюць, растрэльваюць. Нацыянальны спакой, які існуе ў Савецкім Саюзе, зьяўляецца лепшым фактарам агітацыі за Савецкую Ўладу сярод прыгнечаных рабочых і сялян, сярод прыгнечаных нацыянальнасьцяй ва ўсіх капіталістычных краінах, дзе і па гэты дзень ідзе бязьлітасная нацыянальная варожасьць. Буржуазія, якая замазвае клясавыя і нацыянальныя супярэчнасьці, якая хавае адмоўныя факты свайго панаваньня і існаваньня, зразумела, нікolі не дазволіла-б паставіць ні ў адным сваім вышэйшым органе дакладу падобнага роду.

Мы-ж, наадварот, ставім такія даклады. Сёньня наш даклад слухаецца для выяўленьня тых станоўчых дасягненьняў, якія беларускі рабочы і селянін заваявалі за гады пролетарскай рэволюцыі. Мы ставім такія даклады для таго, каб перад працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу выявіць нашы дасягненьні і пашырыць іх на работу іншых нацыянальнасьцяй, насяляючых наш Саюз. Адначасова з гэтым мы хочам адзначыць і тыя недахопы, тыя абмылкі, тыя адмоўныя бакі і труднасьці, якія ёсьць у нашай рабоце. Гэта мы робім для таго, каб агульнымі патугамі выпраўляць недахопы і тым самым хутчэй ісьці па шляху соцыялістычнага будаўніцтва.

На гэтым шляху супярэчнасьцяй і труднасьцяй надзвычайна многа, і таму патрэбны сумесныя патугі працоўных усіх нацыянальнасьцяй, каб перамагаць труднасьці і ісьці больш хуткім тэмпам да вызначанае мэты.

Дасягненьні рабочых і сялян Савецкае Беларусі ня будуць зразумелы ў поўнай меры, калі мы не аднавім у нашай памяці падзеі Кастрычніка 1917 года і бліжэйшых пасьлякастрычнікаўскіх гадоў, калі мы не застановімся некалькі на політычнай гісторыі барацьбы, якую вялі рабочыя і сяляне Савецкае Беларусі. Кастрычнікавая рэволюцыя замацавалася канчаткова на Беларусі толькі ў 1920 годзе, калі былі прагнаны з абшараў беларускіх рабочых і сялян польскія паны, калі сумесна з расійскім пролетарыятам мы канчаткова замацавалі савецкую ўладу ў ліпені 1920 году. Пасьля 1917 году Беларусі прышлося перажыць цэлы шэраг цяжкіх навал, перанесьці прыгнечаньне буржуазіі і імпэрыялістых. У лютым 1917 году тэрыторыю Беларусі захапіла нямецкая буржуазія. Гэты захоп цягнуўся да сьнежаня 1918 году. У гэты пэрыод беларускія рабочыя і сяляне перажылі ўсю жудасьць і жахі панаваньня нямецкага юнкерскага абцасу і папробавалі ўсе „прыгожасьці" буржуазнага панаваньня. Нямецкі буржуазны урад заляцаўся з беларускаю нацыяналістычнаю інтэлігенцыяю, правая, шовіністычна-настроеная частка якое заляцалася да двара, вітала тэлеграмамі Вільгэльма і г. д. Тым ня менш,

Нямеччына Вільгэльма II-га не магла ўтварыць Беларускую рэспубліку і вырашыць нацыянальнае пытаньне, бо ня толькі царская Нямеччына таго часу, але ніводная буржуазная рэспубліка, ніякая буржуазная ўлада і да гэтага часу ня здольна да вырашэньня такога рода пытаньняў. Нямецкая буржуазія не магла ня ведаць аб існаваньні беларусаў. У сваёй кнізе, якая вышла і на рускай мове, Людэндорф піша на 103 старонцы, што з беларусамі лічыцца яму ня прыходзілася, бо палякі нацыянальна іх абяствары́лі. „Увосень 1915 году я хацеў скласьці ўразуменьне аб тым, дзе групуюцца беларусы, і спачатку іх нідзе буквальна нельга было найсьці. Толькі пазьней выявілася, што гэта вельмі распаўсюджанае, але надта апалячанае племя, якое знаходзіцца на такой нізкай ступені культуры, што памагчы яму магчыма-б было толькі пры доўгачасным уплыве". Замест таго, каб памагаць беларускаму рабочаму і селяніну ў яго культурна-эканомічным і гаспадарчым разьвіцьці, нямецкая ўлада, не жадаючы аказваць ніякае дапамогі, заляцала з беларускай інтэлігенцыяй і вадзіла яе за нос; але стоіла толькі асесціі на тэрыторыі Беларусі Савецкай Уладзе і аслабаніць рабочых і сялян, як зараз-жа была абвешчана Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

З гэтага дня—з 1 студзеня 1919 году і вядзе сваё існаваньне Савецкая Соцыялістычння Рэспубліка Беларусі. Пад націскам капіталістычных дзяржаў і іх арміі на заходніх мяжы неабходна было больш цеснае аб'яднаньне БССР з суседняю Савецкаю Літвою. Таму ў мэтах сумеснага адбою ворагаў рабочае класы ў лютым—сакавіку 1919 г. была ўтворана Літоўска-Беларуская ССР, каторая праіснавала да жніўня 1919 года. У жніўні 1919 года беларускія рабочыя і сяляне зноў перажываюць жахі буржуазнага захопу (акупацыі)—на гэты раз ад генэралаў і абшарнікаў. На тэрыторыі Беларусі зноў растрэльваюцца сяляне, расстрэльваюцца за тое, што яны пасьмелі забраць у абшарнікаў-паноў зямлю, саджаюцца ў вастрогі за тое, што падтрымлівалі Савецкую Ўладу і г. д.

Усё гэтае прыгнечаньне, увесь гэты тэрор не маглі не аб'яднаць яшчэ больш рабочых і сялян Беларусі наўкола Савецкае Ўлады. Уся ненавісьць працоўных Беларусі не магла ня выліцца ў партызанскім руху супроць польскай буржуазна-абшарніцкай улады. Заядлая барацьба вялася да 1920 года, калі беларускія рабочыя і сяляне сумесна з рускім пролетарыятам маглі канчаткова аслабаніцца ад панскага (абшарніцкага) прыгнечаньня. 11 Ліпня 1920 года зьяўляецца тым днём, калі сьвяткуецца па ўсёй тэрыторыі БССР, як дзень аслабаненьня ад польскіх угнятацеляў, як дзень, пачынаючы з якога, беларускія рабочыя і сяляне сумесна з пролетарыятам усяго Савецкага Саюзу атрымалі магчымасьць будаваць сваё вольнае жыцьцё на тых прынцыпах, якія камуністычная партыя агаласіла ў Кастрычніку 1917 года.

Пасьля 1920 года мы яшчэ ня мелі магчымасьці прыступіць да нармальнага эканомічнага, культурнага і палітычнага жыцьця, ня гле-

дзячы на ўтвораную ў Рызе ўмову, ня гледзячы на тое, што Польшча абавязалася не нападаць на Савецкую тэрыторыю. Польская дзяржава, якая мяжуецца з намі, навадняла БССР аж да 1922 года бандыцкімі атрадамі, організуючы іх і кіруючы імі праз Савенкава, Булак-Балаховіча і г. д. Ясна, пры такіх абставінах беларускім рабочым і сялянам і Савецкай Уладзе патрэбна было ў гэты час усе свае патугі, усю сваю энэргію асяродкаваць на абароне і замацаваньні савецкага ладу, які ў барацьбе набыў беларускі рабочы і селянін. Нам патрэбна было ўзмацняць кастрычнікавыя заваёвы. Таму да 1922 года мы былі паралізаваны ў нашай мірнай гаспадарчай і культурнай рабоце: нам патрэбна было адбіваць бандыцкія нападкі на нашы вёскі, гарады і мястэчкі, патрэбна было забясьпечыць мірную працу рабочых і сялян, даць магчымасьць яўрэйскаму насяленьню адчуваць, што яно на тэрыторыі Беларусі абаронена ад пагалоўнага насільля і катаваньня, якія ўтваралі над ім банды; патрэбна было наогул замацаваць політычнае панаваньне рабочае клясы. Такім чынам, толькі з канца 1922 года мы атрымалі магчымасьць плячом да пляча падыйсьці да гаспадарчага і культурнага адбудаваньня, да мірнае працы ва ўсіх галінах.

Пачатак гэтае адбудоўчае работы праходзіў ва ўмовах страшэннае разбуранасьці і зруйнаванасьці ўсіх галін гаспадаркі. Многія гарады, як Полацак, Барысаў, Менск і Слуцак, былі зьнішчаны на трэць, на палавіну. Фабрыкі і заводы сталі, маемасьць іх і абсталяваньне было вывезена ці адабрана ў часы окупацыі. Сельская гаспадарка была зруйнована, бо польскае войска, адыходзячае ў 1922 годзе пад націскам Чырвонае арміі, забірала ў сялянства амаль што пагалоўна ўсю скаціну.

Зразумела, што гэтыя разбурэньні і спусташэньні не маглі не адбіцца на тэмпе нашага экономічнага будаўніцтва.

На тэрыторыі Беларусі нам засталіся разбураныя школы. Мы ня мелі тады нават і таго пласту інтэлігенцыі, які мы маем на сёнешні дзень, таму што яна альбо знаходзілася на тэрыторыі іншых савецкіх рэспублік, ці апынулася на польскай тэрыторыі.

Усе гэтыя труднасьці трэба мець на ўвазе, калі мы падлічваем нашы дасягненьні на сёнешні дзень. Нам прыходзілася пускаць у ход фабрыкі і заводы, падымаць сельскую гаспадарку, пашыраць культурную работу ва ўмовах надзвычайнай разрухі, разбуранасьці і беднасьці.

Мы павінны былі тут азнаёміцца коратка з політычнай гісторыяй Савецкай Беларусі, каб на гэтым фоне лепей адзначыць тыя дасягненьні, да якіх прышлі ў сучасны момант рабочыя і сяляне Савецкае Беларусі.

Сёньня на тэрыторыі Савецкай Беларусі, як і на тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюзу, пануе нацыянальны спакой таму, што мы правільна праводзім нацыянальную політыку. Дзякуючы гэтай політыцы, Беларусь канчаткова аб'яднала большасьць беларускага насяленьня на савецкай тэрыторыі. Савецкай Беларусі прыходзілася весьці барацьбу з захопнікамі (акупантамі), бандытызмам і г. д. пры насяленьні толькі ў паў-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

тара мільёны чалавек і тэрыторыі з шасьці паветаў былое Менскае губ. З культурным і гаспадарчым узростам Савецкі Саюз умацняе БССР за лік Віцебскай, Гомельскай, і Смаленскай губэрняў, якія ўваходзілі ў склад РСФСР. Да 1926 году Беларусь налічвала насяленьня 4.200 тысяч чалавек; цяпер-жа, пасьля далучэньня да яе Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, БССР мае ўжо да 5 мільёнаў чалавек насяленьня. За межамі Беларускай ССР і Савецкага Саюзу, на тэрыторыі мяжуючай з намі рэспублікі, знаходзіцца, прыкладна, 3 мільёны беларускага насяленьня, прыгнятаемага ў экономічных, нацыянальных і палітычных адносінах. Самы факт далучэньня Гомельшчыны даказвае, што толькі Савецкая Ўлада бяз войн, без супраціўнасьцяй і нацыянальнай варажасьці можа правільна, па падставе канкрэтнага падліку, на падставе жаданьняў і імкненьняў працоўных, вырашаць нацыянальныя пытаньні. Гомельскі і Рэчыцкі паветы, якія нядаўна далучаны да БССР, шлюць прывітальныя тэлеграмы як Беларускаму, гэтак і Саюзнаму Ўрадам; у гэтых тэлеграмах выказваецца поўнае здавальненьне тым, што гэтыя паветы далучаны да Савецкай Беларусі, дзякуючы таму, у іх ёсьць поўная магчымасьць сумесна з усімі беларускімі рабочымі і сялянамі будаваць сваё жыцьцё на сваёй роднай, зразумелай ім мове і гэтым шляхам яшчэ больш уцягваць шырокія масы сялянства ў нашае савецкае будаўніцтва, бо нават у вышэйшых урадавых установах яны могуць весьці размову на тэй мове, якая ўжываецца ў глухіх беларускіх вёсках. Мы робім усё неабходнае для таго, каб факт далучэньня не адбіўся ў горшы бок на экономічным стане далучаных раёнаў. З дапамогаю Савецкага Саюзу мы робім усё ад нас залежачае, каб пашыраць і ўмацняць прамысловасьць Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. Дзякуючы таму, што ў Гомельскім і Рэчыцкім паветах прамысловасьць разьвіта даволі значна, далучэньне да БССР гэтых паветаў, аднастайных з ёй па мове і па экономічных умовах, узмацняе пролетарскую базу ў Рэспубліцы і забясьпечвае большыя магчымасьці ў справе гаспадарчага і культурна-нацыянальнага будаўніцтва з прыцягненьнем да яго больш шырокіх мас рабочых і сялян.

У Савецкай Беларусі нацыянальная палітыка праводзіцца на грунце тых-жа падстаў, якімі кіруецца ў сваёй нацыянальнай рабоце Саюз ССР. У першую галаву мы забясьпечваем поўнае раўнапраўе ўсіх нацыянальнасьцяй і імкнемся абслугаваць усе нацыянальнасьці на іх роднай мове. Мы вядзем сваю работу так, каб дапамагаць адсталым у мінулым нацыянальнасьцям разьвівацца ў культурнай і гаспадарчай галінах. У гэтай рабоце, як і ў шэрагу іншых галін работы, Беларусь мае асабістыя ўмовы. Перш за ўсё, гарады Беларусі зьяўляюцца пераважна руска-яўрэйскімі. Царскі ўрад моцна русіфіцыраваў насяленьне ў гарадох. Гэта прывяло да таго, што, ня гледзячы на поўнае забесьпячэньне ў сучасны момант для рускага насяленьня магчымасьці разьвіваць сваю культуру, школы і наогул работу ва ўсіх галінах савецкага будаўніцтва на рускай мове, ёсьць яшчэ значныя астаткі рускага чыноўніцтва, якое ня хоча

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

міруцца з тым, што Савецкая Ўлада вядзе за сабою шырокія масы сялянства і разьвівае культуру на іх роднай мове, якая ўперад моваю ня лічылася. Вельмі часта бываюць такія выпадкі, калі паасобныя прадстаўнікі рускай нацыянальнасьці (астаткі рускага афіцэрства, рускага духавенства і чыноўніцтва) выяжджаюць у іншыя раёны нашага Савецкага Саюзу, напрыклад, у Ленінград, організоўваюць там спэцыяльныя аб'яднаньні—„Полоцкое землячество", каб супрацівадзейнічаць Савецкай Уладзе ў БССР праводзіць беларусізацыю і выстаўляюць у праграме сваёй дзейнасьці супрацівадзеяньне разьвіцьцю беларускай культуры, аслабанёнае Кастрычнікавай рэволюцыяй. У членаў ЦВК можа паўстаць пытаньне, ці ня прыгнечваем мы тую ці іншую нацыянальную меншасьць? Я прывёў шэраг фактаў, якія гавораць самі за сябе. У нас няма прыгнечанасьці ні аднэй нацыянальнасьці.

Тав. Ларын, з лупаю вывучаючы ўсе пытаньні ў галіне нацыянальнай політыкі, сёньня сказаў мне, што ў яго няма нічога, з чым можна было-б выступіць на Сэсіі для адмоўнай характарыстыкі нашай работы ў нацыянальнай політыцы.

Наша работа гаворыць сама за сябе. Я паказваю ў дакладзе не казённы дабрабыт, але пералічваю сапраўдныя магчымасьці культурнага і нацыянальнага разьвіцьця для ўсіх нацыянальных меншасьцяй у такой-жа ступені, як і для беларускіх рабочых і сялян.

Другое, што перашкаджае і утварае труднасьці ў правядзеньні нашай нацыянальнай політыкі, гэта наша прымежнае становішча з капіталістычным сьветам. Савецкая Беларусь, знаходзячаяся на Заходняй мяжы, дзеліць два міры: мір, дзе пануе і разьвіваецца вольная праца, пролетарская культура, дзе ва ўмовах нацыянальнага спакою разьвіваецца жыцьцё працоўных усіх нацыянальнасьцяй, і іншы мір, дзе існуе варажасьць, клясавая барацьба, нацыянальная розьня, прыгнечаньне малых нацыянальнасьцяй пануючымі нацыянальнасьцямі. Гэта ня можа не нараджаць труднасьцяй і не ўскладняць нашай работы.

Да ліку перашкод, якія мяшаюць пасьпяховасьці правядзеньня нацыянальнай работы, неабходна таксама аднесьці і недахоп беларускіх інтэлігэнтных сіл. Мінулае, калі былі ганеньні на беларускую інтэлігэнцыю, не пакінула нам колькі-небудзь значнае спадчыны гэтага роду.

У галіне практычнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, мы, акрамя агульна-экономічнага адраджэньня Рэспублікі (што таксама зьяўляецца адным з фактараў нацыянальнай політыкі), праводзім беларусізацыю савецкага апарату. Гэтыя захады накіраваны да таго, каб яшчэ больш зрадніць наш савецкі апарат з гушчаю сялянскага насяленьня. Ня гледзячы на ўсе труднасьці ў гэтай рабоце, мы пасунуліся настолькі, што на сёнешні дзень беларускі рабочы і селянін можа атрымаць у савецкай установе патрэбную яму даведку, а таксама весьці размову на яго роднай мове. Мы робім беларусізацыю вышэйшых навучальных устаноў для таго, каб падрыхтаваць і васпоўніць невыстарчальныя ў



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

нас кадры інтэлігэнцыі новымі сіламі з рабочага і сялянскага асяродкаў, а таксама, каб разгортваць больш хутчэйшым тэмпам нашу агульную работу. Калі гэта неабходна па нацыянальных умовах мы ўсюды пераводзім школы на беларускую мову і гэтым поўнасьцю здавальняем патрэбы беларускіх працоўных мас па навучаньні іх дзяцей на роднай мове. Мы пашыраем сетку культурных і навучальных устаноў, у тым ліку організуем, умацняем і разьвіваем работу Інстытуту Беларускае Культуры для таго, каб, згрупаваўшы там лепшыя культурныя і інтэлігэнцкія сілы, маглі дапамагчы ўсім адсталым нацыянальнасьцям, і, у першую чаргу, беларускай нацыянальнасьці ў яе культурным адраджэньні. Каб палегчыць работу ў галіне беларусізацыі, у галіне папрошчаньня мовы, каб орфографія яе была зразумела самаму адсталаму селяніну, мы правялі Акадэмічную Конфэрэнцыю, якая намеціла шляхі далейшага ўдасканаленьня беларускага пісьма.

У адносінах іншых нацыянальнасьцяў мы можам сказаць, што ні адна з іх ня можа заявіць, што Савецкая Ўлада яе прыгнятае ці крыўдзіць. У працівалегласьць удушэньню, таму цяжкаму становішчу, якое перажывае яўрэйская нацыянальнасьць у капіталістычных краінах, асабліва ў рэспубліцы, якая граніцыць з намі на Захадзе, у працівалегласьць антысэмітызму, мы забясьпечылі яўрэйскай нацыянальнасьці магчымасьць падняцца і сумесна з іншымі нацыянальнасьцямі ісьці па шляху гаспадарчага і культурнага разьвіцьця. Раней на яўрэйскае насяленьне глядзелі, як на насяленьне гандлярскае, бо пры царскай палітыцы, калі яўрэйскае насяленьне было асяродкавана ў „черте оседлости“, у мястэчках і ў гарадох, яму заставалася магчымым займацца толькі гандлем, бо ад іншых заняткаў, асабліва ад службы ў рознага роду ўстановах, яно было не дапушчана. Мы зьнішчылі антысэмітызм, і ў Савецкай Беларусі, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, забясьпечваем працоўным яўрэям права на працу, даем магчымасьць займацца і земляробствам. За гэтыя гады мы прыпарадкавалі ў БССР на зямлю вялікі лік сем'яў працоўных яўрэяў. Гэтым шляхам побач з беларускім селянінам становіцца і працоўны яўрэй. Яны сумесна ўдзельнічаюць у вытворчай працы і гэтым умацняюць экономічнае становішча Рэспублікі. Прыцягненьне да сельскагаспадарчай працы яўрэйскага насяленьня не па душы частцы шовіністычна настроенай беларускай інтэлігенцыі, якая ня супроць калі-ні-калі памарыць аб уціску іншых нацыянальнасьцяй. Але Савецкая Ўлада рашуча адмятае гэтыя тэндэнцыі, сваімі мерапрыемствамі канчаткова зьніштажае ўсе супярэчнасьці, выкідае той пучок антысэмітызму, які пышна расьцьвітаў на Беларусі ў царскія часы, і глеба для якога знаходзіцца дзе-ні-дзе і ў гэты час.

Зразумела, што ва ўмовах аграрнае перанаселенасьці, ва ўмовах цяжкага экономічнага становішча нашае вёскі, мы ня можам поўнасьцю земляўпарадкаваць яўрэйскае насяленьне, якое складае ў нас да 10 проц. усяго насяленьня Рэспублікі. Мы ня можам надзяліць зямлёю ў межах

БССР усіх жадаючых і мяркуем забясьпечыць земленадзяленьне працоўных яўрэяў у другіх мясцовасьцях Саюзу ССР. Мы маем надзею, што гэтае пытаньне будзе вырашана поўнасьцю іменна такім шляхам.

Даючы яўрэям права на працу ва ўсіх галінах гаспадаркі і кіраўніцтва нароўне з другімі нацыянальнасьцямі, мы гэтым самым уцягваем яўрэйскае насяленьне, яўрэйскага рабочага ва ўсе вытворчыя процэсы і зьніштажаем антысэмітызм, зьніштажаем той няправільны погляд на яўрэяў, які прышчапляўся штучна ў царскія часы.

Там, дзе жыве яўрэйскае насяленьне, мы адчыняем яўрэйскія школы, організуем тэхнікумы, каб рыхтаваць яўрэйскую інтэлігенцыю. Мы ўтварылі яўрэйскі тэатр, якога ў царскія часы ня было. Ён мае вялікі посьпех ня толькі сярод яўрэйскага насяленьня, але і сярод усяго працоўнага насяленьня Беларусі.

У Сельска-Гаспадарчай Акадэміі ёсьць яўрэйская катэдра для падрыхтоўкі аграномаў, землеўпарадкавацеляў, мэліоратараў з асяродку яўрэйскага насяленьня, іменна такіх, якія, уладаючы яўрэйскаю моваю, змаглі-б праводзіць работу сярод яўрэйскага сялянства. У Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце ёсьць яўрэйскае аддзяленьне для падрыхтоўкі кадраў інтэлігенцыі, культурных працаўнікоў з рабочых і сялян яўрэйскай нацыянальнасьці. У нас ёсьць спэцыяльныя яўрэйскія народныя суды для абслугоўваньня яўрэйскіх мас. Мы організавалі спэцыяльныя сельскія і местачковыя саветы, якія вядуць работу на яўрэйскай мове. Некаторыя профэсыянальныя саюзы (швэйнікаў і часткова гарбароў), сябры якіх пераважна яўрэі, вядуць культурна-выхаваўчую работу на яўрэйскай мове сярод сваіх сяброў.

Усё гэта, бязумоўна, прысьпяшае і палягчае культурнае і гаспадарчае ўмацненьне становішча працоўных мас яўрэйскага насяленьня. Аднак мы ня можам заявіць, што ў гэтай галіне ўжо няма труднасьцяй. Пытаньне аб мястэчках зьяўляецца ў нас надзвычайна трудным. Проблема мястэчак патрабуе свайго вырашэньня ня толькі ў БССР: яна ў роўнай ступені стаіць і перад Украінай, і РСФСР, дзе ёсьць мястэчкі. У нас мястэчак многа. Ня гледзячы на цэлы шэраг захадаў, зробленых Беларускім Урадам, проблема яўрэйскага насяленьня ў мястэчках ня вырашана. Надзвычайны натоўп і беднасьць насяленьня, непадрыхтаванасьць узрастаючай моладзі да вытворчае працы перашкаджаюць ліквідаваньню беспрацоўя і вырашэньню ўсіх пытаньняў, якія стаяць перад яўрэйскай працоўнаю масаю Беларусі.

У гэтай справе патрэбна дапамога ўсяго Савецкага Саюзу. Неабходна зрабіць захады да таго, каб організаваць карысную працу сярод местачковага насяленьня, выхаваць у ім тэхнічныя звычкі да працы.

З разьвіцьцём профтэхнічнае асьветы сярод моладзі і дарослага яўрэйскага насельніцтва, з пашырэньнем земляробскай дзейнасьці, з разгортваньнем прамысловасьці і дробных саматужных промыслаў удасца канчаткова вырашыць проблему мястэчак.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Суседняя з намі Заходняя рэспубліка пачала, заляцаючы з яўрэйскаю буржуазіяю капіраваць нашы захады. У апошні час у польскіх газэтах пішуць, што ў Польшчы для яўрэяў балот не шкадуюць. Мы, бязумоўна, упэўнены, што яны не шкадуюць балот для яўрэяў, каб патапіць іх у гэтых балотах. Наўрад ці мы можам быць упэўнены ў тым, што польскія паны дадуць магчымасьць, праводзячы мэліорацыю (што робім мы), расьсяліць працоўнае яўрэйскае насяленьне на новых землях.

У Польшчы робяць усё для таго, каб на асушку балот занімаць капітал у багатага амэрыканскага дзядзькі.

Асушыўшы балоты на амэрыканскія грошы, паны адымуць зямлю і будуць насаджваць асадніцтва. Мы-ж разьвіваем і ўмацняем культуру і экономічную работу сярод яўрэйскай нацыянальнасьці таксама, як і сярод іншых.

У БССР ёсьць і польская нацыянальнасьць. Беларускія шовіністыя, дробна-буржуазныя палітыкі за мяжою, накшталт Ярэміча, гаварылі мне: „Нашто вы даеце магчымасьць разьвіваць польскай культуры? Вы павінны прыгнечваць польскую нацыянальнасьць таксама, як гэта робіць суседняя з намі Польская рэспубліка ў адносінах да беларускага насяленьня“.

Мы—ня дробна-буржуазныя палітыкі і не заражаны элемэнтамі помсты. Мы ўзялі ўладу не для таго, каб помставаць. Наадварот, мы робім усё неабходнае, каб польская нацыянальнасьць абслугоўвалася на яе мове.

Мы робім усё неабходнае, каб кнігаю, школаю была забясьпечана таксама і польская нацыянальнасьць. Мы гэта робім у аднолькавай ступені як для беларускага, гэтак і для яўрэйскага і польскага насяленьня. У нас ёсьць польскія школы, пэдагагічны польскі тэхнікум для падрыхтоўкі польскай інтэлігенцыі з рабочых і сялян. Намі організаваны сельскія саветы, якія абслугоўваюць польскае насяленьне на польскай мове. У Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце ёсьць польскі сэктар для падрыхтоўкі новых кадраў культурных працаўнікоў сярод польскага насяленьня.

Ясна, што ўсё гэта ўмацняе становішча Савецкае Ўлады сярод гэтае нацыянальнасьці, і таму для Польскай рэспублікі няма зараз больш зьлейшага ворага на нашай тэрыторыі, як польскае насяленьне, якое, бачачы нашу вялікую культурна-палітычную работу ва ўсіх галінах, у тым ліку і ў нацыянальнай палітыцы, не прабачыць польскай буржуазіі прыгнечаньне культуры другіх нацыянальнасьцяй на польскай тэрыторыі, не прабачыць адступленьня ад Рыскае ўмовы, па якой Польская рэспубліка абавязалася даць магчымасьць разьвіцьця ўсім нацыянальным меншасьцям на польскай тэрыторыі. Дзеля відавочнага адхіленьня ад Рыскае ўмовы падымаецца хваля нездавальненьня і абурэньня ня толькі сярод працоўных Савецкай Беларусі, але і сярод нацыянальнасьцяй, якія цяпер прыгнятаюцца ў Польшчы. У такім-жа напрамку абслугоўваюцца



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

намі і іншыя нацыянальныя меншасьці: латышы, літоўцы і інш. Вось, прыкладна, рысы практычнае работы ў галіне нацыянальнай політыкі, якая праводзіцца намі. Гэтая работа нарадзіла і ўмацняе нацыянальны спакой. Мы маем права сказаць, што толькі Кастрычнікавая рэволюцыя вырашыла поўнасьцю нацыянальнае пытаньне і дала магчымасьць разьвіваць культуру ўсіх нацыянальнасьцяй, асабліва беларускай, якая ўперад стагодзьдзямі прыгняталася царскаю ўладаю.

Я ўжо адзначаў, што пасьля імпэрыялістычнай і грамадзянскай войн, ад пэрыоду акупацыі, мы атрымалі зруйнаваныя фабрыкі, зруйнаваныя гарады і вёскі, зруйнаваныя школы, спаленыя масты і г. д. Беларусь пераважна краіна землямробская. Гарадзкога насяленьня налічваецца ў ёй 16 проц. Гарады за апошнія гады растуць у той час, як горад Вільня вымірае, насяленьне ў ім памяншаецца. Сельскага насяленьня ў нас 84 проц. Ня гледзячы на тое, што БССР землямробская краіна, яна зьяўляецца краінаю, якая спажывае: у 1926-1927 годзе мы павінны будзем прывезьці з іншых раёнаў Савецкага Саюзу да 15 мільёнаў пудоў хлебу. Наша географічнае становішча выгадна для разьвіцьця нашай прамысловасьці і нашай сельскай гаспадаркі. Гэтаму дапамагае густая сетка чыгунак. У адносінах чыгунак і выгодных рачных шляхоў, злучаючых Беларусь з Украінаю і іншымі раёнамі, мы знаходзімся ў спрыяючых умовах. Да вайны беларуская прамысловасьць насіла дробны характар. Цяпер мы ўмацняем нашы прадпрыемствы. Для разьвіцьця прамысловасьці мы маем выстарчальныя рэсурсы. Энэргетычная база БССР даволі магутная: запасы торпу ў нас невычарпаемыя. Тарпянікі на дасьледаваных плошчах займаюць звыш 200 тыс. дзесяцін з вялізарнымі запасамі торпу. Да таго-ж у БССР ёсьць лішак рабочае сілы, які залежыць ад аграрнае перанаселенасьці, у нас на вёсцы ад 25 да 35 проц. лішняе, нескарыстоўваемае працы. Вялікая колькасьць дарослага насяленьня бяз шкоды для сельскае гаспадаркі магла-б ісьці на фабрыкі і заводы. У дарэволюцыйныя часы беларускія рабочыя і сяляне давалі сваю рабочую сілу капіталістым усіх краін. Яны выяжджалі ў Амэрыку, Нямеччыну, на Урал, у Донбас і г. д. Цяпер-жа, для зьнішчэньня аграрнай перанаселенасьці, для вырашэньня асноўнай праблемы, якая стаіць перад Савецкаю Беларусьсю і яе ўрадам, патрэбна максімальна магчымае разьвіцьцё прамысловасьці на месцы і мэліорацыя забалочаных зямель, якія ў сучасным іх стане не даюць ніякай карысьці.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы